# Паважаныя калегі! Дарагія сябры! Віншуем з Сусветным днём метралогіі!

**Паважаныя калегі! Дарагія сябры!**
**Віншуем з Сусветным днём метралогіі!**

Метралогія-навука аб вымярэннях, а вымярэння – адзін з найважнейшых шляхоў пазнання. Яе значэнне цяжка пераацаніць, яна адыгрывае вялікую ролю ў сучасным грамадстве. Навука, прамысловасць, Эканоміка і камунікацыі не могуць існаваць без вымярэнняў. Кожную секунду ў свеце выпрацоўваюцца мільярды вымяральных аперацый, вынікі якіх выкарыстоўваюцца для забеспячэння якасці і тэхнічнага ўзроўню выпускаемай прадукцыі, бяспечнай і безаварыйнай працы транспарту, абгрунтавання медыцынскіх дыягназаў, аналізу інфармацыйных патокаў і інш.

Святкаванне гэтага дня з'яўляецца прызнаннем вынікаў і важнасці прафесійнай дзейнасці спецыялістаў метралогіі усяго свету. Сёння любая вобласць жыццядзейнасці чалавека не магчымая без вымярэнняў, адзінак велічынь і эталонаў, службы па забеспячэнні адзінства вымярэнняў, якая з'яўляецца арганізуючым цэнтрам у галіне вымярэнняў у кожнай асобнай краіне і ў цэлым ва ўсім свеце.

Сёння ў Полацкім ЦСМС на ўрачыстым сходзе, прысвечаным Сусветнаму дню метралогіі, адбылося ўзнагароджанне супрацоўнікаў ганаровымі граматамі і падзякамі!

Няхай гэты дзень прынясе вам шмат станоўчых эмоцый, добры настрой, прыліў сіл і новыя перспектывы ў справе развіцця метралогіі. Жадаем вам міру і дабра, поспехаў і дабрабыту ў вашай адказнай справе.
Моцнага здароўя і ўдачы вам і вашым блізкім!